Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 12 Вільня, Чацьвер 20 Сакавіка 1930 г. Год VI (XIV).

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Гаэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.

„Бел. КРЫНІЦА“ каштуе на год—6 зл., на паўгода — 3 зл., на 3 месяцы — 2 зл.. ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Цана абвестак: на 1-шай староны 60 гр., 2 і 3 — 50 гр., на 4-ай — 40 грш. — за радок дробнага друку ў адной шпальце

Сьвята Незалежнасьці.

(25. III. 1918 — 25. III. 1930)

Ужо 12 гадоў мінае, як была абвешчана ў Менску Незалежнасьць Беларусі. 12 гадоў — гэта не вялікі час, але і не малы. Раўняючы гэты час з часам разьвіцьця і будаваньня другіх дзяржаваў, дык 12 гадоў— гэта нішто, але раўняючы з разьвіцьцём нашага народу, дык гэты час мае вялікую вагу і значэньне.

Да 1917 году г. зн. да вялікай расейскай рэвалюцыі, беларусы толькі ў душах сваіх сьнілі аб незалежнасьці. Расейская дзяржава праз доўгі час так прыдушыла ўсе парывы паднявольных народаў, што тыя не маглі нават аказацца з сваімі думкамі. І Беларускі народ праз доўгі час толькі гаварыў аб аўтаноміі ў граніцах Расейскай дзяржавы.

Калі-ж веліч гэтай дзяржавы рухнула і калі апалі ланцугі з рук і ног паднявольеных народаў, калі рэвалюцыя дала свабоду выяўленьня сваіх думак, тады загаварыў і Беларускі народ і 25 III. 1918 свае думкі замяніў на **слова**.

Вялікае гэта было слова: **Беларусь абвешчаецца вольнай і незалежнай дзяржавай** і парывае ўсе сувязі з бышай Расейскай імпэрыяй!

Гэта было Слова Незалежнасьці, Слова Свабоды паднявоенага народу.

* * *

Ад думак да Слова этап быў пройдзены. Ён ужо далёка за намі. Ужо 12 гадоў, як беларускі народ жыве ў другім этапе, у этапе ўцялесьненьня Слова.

* * *

Як-жа беларускі народ праводзіць уцялесьненьня Слова?

Ведама, што ніякай вялікай мэты нельга дасягнуць адразу. Да яе заўсёды трэба ісьці дарогай трудоў і працы.

Вось-жа Беларускі Народ з кожным годам што раз мацней становіцца на свае ўласныя, беларускія ногі, ён жыве, адраджаецца, ідзе напераn і пакрысе здабывае належныя сабе правы... Ён будзе жыць.

* * *

Толькі перашкоды вялікія ставяць цяпер Беларускаму народу ягоны ворагі. Чырвоныя „валадары" атрымаўшы спадчыну па даўнейшых царох, задумалі такжа прыдушыць Беларускі народ. І там дзе, здавалася, найбуйней расьцьвіце Слова беларускай культуры, раздаецца вялікі стогн беларуса.

Беларускі інтэлігент, работнік і селянін церпяць за тое, што адважваюцца выказаць слова сапраўднай Незалежнасьці свае Бацькаўшчыны.

* * *

Але не загіне вялікае Слова. У ім моц і сіла. Кожны год беларусы прыпамінаюць сабе гэтае Слова — і тады сьвяточны ўспамін лунае па ўсім краі, усе кажуць: сяньня нашае сьвята, сяньня сьвята Беларускага народу.

* * *

Аддаляючыся з кожным годам ад 25 III. 1918 г., Беларускі народ не аддаляецца і не забываецца аб тых ідэалах, якія былі абвешчаны ў гэты Вялікі дзень.

Беларусы!

Гэтым Беларускі Нацыянальны Камітэт паведамляе, што: у аўторак 25 сакавіка с. г. прыпадае дзень Вялікага Беларускага Народнага Сьвята — 12 ўгодкі **Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі.**

За прыкладам мінулых гадоў Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні ладзіць і сёлета ў гэты Вялікі Дзень 25 САКАВІКА ўрачыстае сьвяткаваньне з наступнай праграмай: **У аўторак 25 сакавіка с. г.** 1) а гадзіне 10 раніцы набажэнства ў касьцеле сьв. Мікалая (завул. сьв. Мікалая); 2) а гадзіне 12 дня набажэнства ў царкве сьв. Мікалая (Вялікая вул. 30); 3) а гадзіне 6 вечарам урачыстая акадэмія і канцэрт у салі Купецкай (вул. А. Міцкевіча 33А).

Гэтае паведамленьне Бел. Нац. К-т просіць уважаць за запросіны.

Урад Бел. Нац. К-ту.

Памяці Тараса Шэвчэнкі.

(У 69-ыя ўгодкі Яго сьмерці).

Між народам беларускім і ўкраінскім, рэч зразумелая, павінны быць самыя прыязныя, самыя цесныя адносіны, якія ў першую чаргу павінны апірацца на ўзаемным пазнаньні. Узаемнае пазнаньне гісторыі, культуры, палітычных імкненьняў бязумоўна становіць той цэмэнт, які так блізкія братнія народы ўкраінскі і беларускі зрадніў-бы больш, злучыўбы яшчэ бліжэй і стварыў-бы сапраўды адну дружную сям'ю ў іх так цяжкай жыцьцёвай падарожы.

Усё гэта, праўда, кожнаму зразумела. Аднак-жа трэба сьцьвердзіць, што дагэтуль гэтага зьбліжэньня, апёртага на ўзаемным пазнаньні між украінцамі і беларусамі, ёсьць дужа мала, ды яно бадай яшчэ ў зародку.

Вось 10 сакавіка сёл. году мінула 69 гадоў ад дня сьмерці вялікага ўкраінскага паэта, народнага прарока, патрыярхі ўкраінскага адраджэньня Тараса Шэвчэнкі. А беларусы гэты вялікі факт абышлі маўчком. Нават нашы студэнты, явія першыя павінны былі скарыстаць з гэтай рэдкай аказіі і пазнаёміць беларускае грамадзянства з геніем Украіны, маўчалі так-жа. Можа гэтае маўчаньне ў беларускім старэйшым і маладзейшым грамадзянстве патрэбна дзеля таго, каб ня псуць полёнофільскай лініі, якую пэўныя адзінкі сяньня сярод нас праводзяць? Калі так, дык дужа сумна! Ня тудою наша дарога!..

Тарас Шэвчэнко радзіўся 1814 г. у сяле Морынцах, Зьвенігародзкага пав. Кіеўскай губ. Бацькі яго, будучы пад паншчынай, сыну свайму не маглі даць ніякага ўзгадаваньня. Гадавалі яго шырокія ўкраінскія стэпы. Ды хутка зьмёрлі бацькі Тараса. На 12 годзе жыцьця ён ужо круглы сірата. Ад гэтага часу бачым Тараса — бяздомніка то ў мясцовага дзячка, у якога ён навучыўся граматы, то ў жывучых у суседзтве маляроў, ад якіх пазнаёміўся з пачаткам малярства, то звычайным пастухом авец, то слугою ў пана, які і выслаў яго на навуку сьпярша ў Варшаву, а пасьля ў Пецярбург.

У Пецярбурзе Тарас Шэвчэнко выявіў свой талент вялікага паэта і маляра і зблізіўся з выдатнымі тагачаснымі расейскімі прадстаўнікамі паэзіі і мастацтва. Дзякуючы гэным людзям, а ў іх радзе вялікаму расейскаму паэту Жукоўскаму, Тарас быў выкуплены ад паншчыны і стаўся вольным.

1846 г. Тарас прымкнуў да кірыла-мяфодзеўскага таварыства, гэнага зародка сучаснага ўкраінскага нацыянальнага адраджэньня. У гэтым часе ён шмат пісаў па ўкраінску, а так-жа ня мала маляваў. За гэтую працу царскі ўрад у 1847 г. саслаў Тараса ў Орэнбурскі край. Пісаць і маляваць у гэнай ссылцы яму было забаронена сурова. Калі-ж, дзякуючы добрым людзям, гэта дзікая забарона была скасавана і Тарас пісаў і маляваў далей, царскія ўлады саслалі яго ў сібірскую глуш Новапятроўскае. Урэшце, дзякуючы стараньням лепшых расейскіх людзей, асабліва графа Ф. П. Талстоя і яго жонкі 1857 г. Тарас Шэвчэнко атрымаў поўную свабоду.

Будучы вольным, Тарас з няволі вярнуўся ізноў у Пецярбург, дзе ўсёй душой аддаўся літэратуры і малярству. З Пецярбургу часта выяжджаў на бацькаўшчыну, дзе 10.III.1861 г. памёр і пахаваны.

Тарас пакінуў па сабе спадчыну свайго творства ў форме паэтыцкай літэратуры, а так-жа розных абразоў і малюнкаў.

Галоўныя літэратурныя творы Тараса: „Кобзар“ — зборнік паэзіі і поэмы: „Тарасова ноч“ і „Гайдамакі“. Паэзія Тараса слушна можа быць названа люстрам украінскага жыцьця ў ва ўсёй яго поўні. Паэзія Тараса ёсьць — вялікай вартасьцю паэтыцкай, поўна глыбокага сардэчнага патрыятызму, пачуцьця рэлігійнага і этычнага ў хрысьціянскім разуменьні.

Паэзія Тараса, малюючы тагочаснае жыцьцё Украіны, кідае так-жа прарочае сьвятло і на будучыню. Дык сяньня ўкраінскі народ, які так хутка ідзе да сваіх лепшых дзён, ідзе гледзячы ў тыя ідэалы, якія высьціў іх бацька, іх патрыярх, іх геній, іх прарок — несьмяротны Тарас Шэвчэнко.

Дзень сьмерці Тараса украінцы сьвяткуюць усюды, дзе толькі лёс іх закіне.

У Вільні, украінскае грамадзянства, якое становяць пераважна студэнты, так жа не забывае аб памяці свайго слаўнага Тараса ў гадаўшчыну сьмерці яго.

8 сакавіка сёл. году за прыкладам мінулых гадоў віленскія украінцы ў салі Сьнядэцкіх Унівэрсытэту зладзілі ўрачыстую акадэмію, пасьвячаную памяці Тараса Шэвчэнкі. Праграму акадэміі станавілі: рэфэрат, красамоўна сказаны паслом Сойму пралатам з Львова а. Куніцкім, прыгожы украінскі хор, ігра на украінскім нацыянальным інструманце на кобзе, украінскія нацыянальныя скокі. Праграма ўся была выканана без заганы. Саля была перапоўнена публікай. Сярод беларусаў і літвіноў на салі было нямала так-жа і палякоў. На ўсіх прысутных украінскі вечар у чэсьць вялікага Тараса Шэвчэнкі зрабіў незацёртае ўражаньне.—Жыве Украіна і жыць будзе напэўна — было на вуснах бадай кожнага ўчасьніка Шэвчэнкавай акадэміі... М. К—к.

Благое ўзгадаваньне вучняў Віленскай Беларускай Гімназіі.

Пад рэдактарствам дырэктара Віл. Бел. Гімназіі Р. Астроўскага выходзіць „Вучнёўскі Звон", „часопіс вучнёўскай моладзі" тэй-жа гімназіі. Вось-жа ў нумары 2 гэтага „Звону" ў стацьці: „**Нашым крытыкам**" спатыкаем рэчы, якіх тайком абысьці нямажна.

Праўда, у гэтай стацьці вядзецца спор „Звону" з „Шляхам Моладзі", дык здавалася-б, што гэта іх „прыватная" рэч і нікому да яе няма ніякага дзела. Але гэта толькі так здаецца. Спор гэны ў „Вучнёўскім Звоне" вядзецца так горача, так ненавісна да сваіх „праціўнікаў", так злосна, што чытачу з боку дае цалком ад'емнае ўражаньне аб выхаваньні нашай моладзі ў віленскай беларускай гімназіі. „Звон" стварае і падтрымлівае такую душную, нездаровую атмасфэру, што моладзь наша ў ёй сапраўды задушыцца можа.

Але гэта яшчэ ня ўсё. „Вучнёўскі Звон" распраўляецца так-жа з беларускай грамадзка-палітычнай думкай. Знаходзім там проста наглыя і хуліганскія выпады проціў „Беларускай Крыніцы". Гэта знача, што вучні ўводзяцца ў вір палітычнай барацьбы. Аб'яў проста жудасны! Гэтакае ўзгадаваньне—гэта ўзгадаваньне проста вулічнае і згубнае.

Рэч зразумелая — мы ані абражаемся на нашу моладзь, якая ў сваей часопісі з дазволу дырэктара, як рэдактара гэтай часопісі, пазваляе адносна нас недапускальныя вольнасьці, ані думаем весьці з ей палеміку, адно толькі зварачваем на гэты сапраўды сумны факт увагу (ня дырэктара, бо робіцца-ж гэта з яго ведама), нашага грамадзянства, бацькоў і бацькаўскага камітэту. Сапраўды, калі гэтакім мае быць узгадаваньне дзяцей нашых, якім яно ёсьць сяньня, дык аб лёсе іх трэба моцна падумаць!

* * *

Калі гора цябе напаткае
І ты плакаць тады на'т гатоў,
Ня плач, браце! хай сьлёзаў ня знае
Сынок вольных калісь Крывічоў.
Калі жыцьцё табе ўжо ня міла
І ты клясьці яго на'т гатоў —
Не кляні, мой ты браце, пахілы,
Сынок вольных калісь Крывічоў.
Калі хмара павісьне панура
І Край родны пакрые узноў,
Ці ўздымецца страшная бура —
Ты змагайся, ты-ж сын Крывічоў.
Н. Жальба.

З газэт.

І тыя пазналіся·

Чэскі месячнік „Slovansky Prehled" шмат звычайна падае вестак аб жыцьці беларусаў. Вось-жа за месяц студзень с.г. зьмясьціў ён так-жа шмат чаго цікавага аб нашых новых полёнофілах. Між іншым чытаем там, што ў беларусаў паўстала „групка актывістаў на чале з А. Луцкевічам". На гэта мусімо сказаць, што лепш гэнай групкі ахрысьціць і ня можна. Актывістамі ў палітыцы называюцца людзі, якія апіраюцца на ўрад тэй дзяржавы, ад якой у даны мамэнт залежаць. Такія палітыкі ў адраджэньні народаў, ня маючы ніякай пазытыўнай ідэолёгіі, звычайна больш прыносяць шкоды, як карысьці. Яны не гадуюць народ і ня вучаць яго хадзіць сваімі дарогамі, але прывучаюць яго парабкам бадзяцца па чужых закутках. Дык сапраўды актывістам ёсьць Луцкевіч. Ён супрацоўнічаў з немцамі, пасьля з палякамі, пасьля ар'ештаваўся на бальшавікоў і урэшце абапёрся ўзноў на палякоў.

З Беларускага жыцьця.

З БЕЛАРУСІ ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Студэнты пратэстуюць. Беларуская студэнская моладзь, якая зарганізавана ў Беларускі Студэнскі Саюз, дня 18 г. м. наладзіла протэстацыйны мітынг супроць прасьледаваньня комуністамі ў Радавай Беларусі беларускага жыцьця народнага і рэлігійнага.

На мітынгу аднагалосна прынята наступная рэзалюцыя:

„РЭЗАЛЮЦЫЯ.

Вынесена на Протэстацыйным Мітынгу,ладжаным Студэнтамі Беларусамі У.С.Б. 18 сакавіка 1930 г. супроць перасьледаваньня Беларусаў бальшавіцкімі ўладамі ў Савецкай Беларусі.

Беларуская студэнская моладзь Віленскага Унівэрсытэту востра пратэстуе супроць жорсткага перасьледаваньня бальшавіцкімі ўладамі ў Б.С.С.Р. усіх праяваў беларускага адраджэнскага руху, а іменна:

1. Супроць бязлітаснага разбураньня і нішчаньня маскоўскімі камуністычнымі ўладамі ўсіх тых культурна-навуковых варгасьцяў беларускага народу, якія з непамернымі высілкамі ўдалося здабыць дагэтуль.

2. Супроць спыненьня нармальнай дзейнасьці Беларускай Акадэміі Навук у Менску, шляхам выкіданьня з ліку яе сяброў заслужаных на ніве беларускае навукі і культуры людзей, шляхам уважаньня ўсяго беларускага антысавецкім і буржуазным, шляхам нападу на ўсе паважнейшыя праявы беларускай культуна-навуковай дзейнасьці.

3. Супроць жорсткага нападу і перасьледаваньня беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў за іхнюю нацыянальную сьвядомасьць у сваіх творах.

4. Супроць правакатарскіх нападаў на беларускіх культурных і грамадзкіх дзеячоў, выкіданьня іх з высокіх становішчаў Беларусі ды замены іх імпортаванымі, варожымі беларускасьці элемэнтамі.

5. Супроць арыштаў і ссылак на Салоўкі выдатнейшых беларускіх дзеячоў і культурных працаўнікоў, як Ф. Аляхновіч, В. Ластоўскі і многа іншых.

6. Мы протэстуем так-жа супроць эканамічнага і маральнага нішчэньня беларускага сялянства, шляхам крывавага праводжаньня калектывізацыі, масавых растрэлаў ды ссыланьняў яго на Сібір.

7. Протэстуем так-жа супроць ганебнага падаптаньня свабоды сумленьня і адвечнае традыцыі беларускага народу, якім есьць крываве перасьледаваньне рэлігіі.

Бяручы ўсе вышэйшае пад увагу, сьцьвярджаем, што Масква есьць заўсёды забойчым ворагам Беларусаў незалежна ад таго, у якім абліччу выступае, што сучаснае перасьледаваньне ўсіх праяваў беларускае думкі і творчае працы беларускага народу ў Б.С.С. Р. есьць вынікам паходу расейскага шавінізму і вялікадзяржаўніцтва проці ўсяго беларускага.

Аднача́сна протэстуем супроць монополізаваньня беларускага руху ў Заходняй Беларусі маскоўскім прыслужнікам, як Беларускі Пасольскі Сялянска-Работніцкі Клюб і іншыя. Ганьба ім!

Схіляючы з пашанаю свае галовы перад усімі ахвярамі маскоўска-камуністычнага тэрору у БССР. перад усімі тымі, якія ня гледзячы на ўсе крывавыя перасьледаваньні, горда трымаюць свой нацыянальны штандар, выражаем: Слава, Слава Ім.

Нашым народным абавязкам ёсьць непрымірымае змаганьне з забойчым наступам маскоўскага камунізму проці усіх праяваў беларускага вызваленчага руху, да чаго і заклікаем усё беларускае студэнства і беларускі народ наагул.

Беларуская студэнская моладзь заяўляе перад усім культурным сьветам і перад на-

Стараверы ў нас.

Спаміж насельнікаў-хрысьціян на беларускіх абшарах пад Польшчай значную частку становяць стараверы. Няслушна ў некаторых мяйсцох іх называюць маскалямі. Маскаль, як паказвае самы назоў, гэта чалавек з Маскоўшчыны, а нашыя стараверы прыйшлі да нас гадоў 200 таму не з Маскоўшчыны, а з Пскоўшчыны. Аб гэтым даводзе іхная мова, у якой ёсьць шмат слоў і зваротаў чыста псковускіх. Стараверы—гэта патомкі нашых найбліжэйшых суседзяў з поўначы. Ці ня прыродны інстыкт пхнуў іх шукаць ратунку ад рэлігійных прасьледаваньняў маскоўскіх цароў ня ў каго другога, толькі ў сваіх бліжэйшых паўдзённых суседзяў — беларусаў, у надзеі, што беларус ахвотна паможа суседу ў бядзе!? І перасяленцы не ашукаліся. За час даволі доўгага сужыцьця беларусаў і староверўаў ня можна прыцяміць ані воднага выпадку сваркі ці незадаваленьня паміж імі. Часта-густа жывучы ў перамешку ў адной вёсцы, як беларусы, гэтак сама й стараверы, жывуць у поўнай згодзе між сабой, адным спосабам здабываючы сабе кавалак хлеба з зямлі й дапамагаючы адзін другому ў патрэбе па суседзку.

Тыя рэлігійныя уціскі, якія спаткалі стараверау пасьля падзелу Польшчы, ішлі ад расейскага ураду і ў гэтых уціскох няма й сьледу суседзкай беларускай рукі. Беларусам так сама цяжка прыходзілася пад урадамі царату. як і староверам, толькі з тою розьніцаю, што староверау ціснулі рэлігійна, а нацыянальна не. Прыкладам школы: хаця пад царатам наагул у нас мала было школаў, але ўсёж-ткі яны для староверау былі роднымі, нацыянальнымі. Беларусы, наадварот. не цярпелі **гэткага** рэлігійнага уціску, як стараверы, але затое іх не лягчэй ціснулі нацыянальна. Царскія ўрады проста не прызнавалі йснаваньня беларусаў, як народу. Аб беларускіх школах пэўна-ж і мовы не магло быць.

Жывучы цэлымі стагодзьдзямі пад уціскам афіцыяльнай царквы й чыноўніцтва, стараверы хаця-не-хаця ўзгадавалі ў сваім характары некаторыя ад'емныя рысы.

У кожным чыноўніку старавер бачыў, і слушна, асабістага ворага, гатовага ў кожны мамэнт навясьці на яго бяду. Гэтак з часам старавер стаў схаваным сам у сабе й недаверлівым да другога.

Каб утрымаць сваю рэлігійную незалежнасьць, старaверам прыходзілася ашуківаць чуткасьць чыноўнікаў, лагодзіць апошніх падаркамі, ужываць побач з добрымі часта й нягодныя спосабы. Гэткім чынам у іх завяліся новыя ад'емныя прыкметы характару: пахлебства, нахіл да йлжы.

Пад царатам паліцыя часта-густа нападала на ціхую староверскую вёску, рабавала малельню, гдзе няраз знаходзіліся вялікай цэнасьці: старыя абразы, кнігі й іншыя рэчы, якія й без свaей археолёгічнай цэннасьці мелі нязьмерную цану ў вачах веруючай люднасьці, крэпка прывыкшай да сваёй рэлігіі. Зрабаваныя рэчы прападалі беспаваротна. Гэткія адносіны прадстаўнікоў правапарадку да чужой маемасьці, ведама-ж, прывучалі й староверау гэтак сама не шанаваць чужой уласнасьці. Вось чаму паміж старaверамі часьцей, чым паміж беларусамі, здараюцца выпадкі крадзежаў.

Няраз доўгімі гадамі здабытае багацьце ці то грамадзкае, ці то нават асабістае ў кароткім часе прападала за простую прывязанасьць да бацькаўскай веры. Гэта прывучыла старaвера да зачыняньня вачэй на будучыню і затое мы часта бачым, што старавер менш думае аб заўтрашнім дню, чым беларус.

Усе гэтыя ад'емныя рысы характару старaвераў ня ёсьць іхняй нацыянальнай адзнакай, а з'яўляюцца толькі вонкавым пры-

шымі ворагамі, што беларускі адраджэнскі рух, перайшоўшы цярністы шлях крыві і магілаў, ня умрэ, бо ён ёсьць агульнанародным імкненьнем, бо за яго кожны з нас гатоў жыцьцё сваё злажыць у ахвяры.

Дык проч усякія арганічэньні прыродных правоў беларускага народу. Проч усякія нішчэньні і разбураньні усяго таго, што ёсьць нам наймілейшым. Проч маскоўска-камуністычны чырвоны тэрор у БССР. Няхай жыве Вольная Злучаная і Незалежная Беларусь!"

Прыняўшы гэту рэзалюцыю студэнты грамадою пашлі пад будынак, дзе месьціцца сэкрэтар'ят Бел. Сял. Раб. Пас. Клюбу і там зьбілі вывеску ўспомненага сэкрэтар'яту.

Далейшым дамонстрацыям, якія маглі кончыцца разгромам сэкрэтар'яту, перашкодзіла паліцыя, якая праз цэлую ноч сьцерагла сэкрэтар'ят Сял. Раб. Пас. Блюбу.

„На Варце". Пад такім загалоўкам пачала выходзіць у Варшаве друкаваная пабеларуску газэта, якая ганіць усё, што ёсьць беларускае і надта-ж хваліць бальшавіцкія парадкі. Пра парадкі ў Польшчы гэтая газэта ані заікнецца, як быццам у Польшчы так усё добра, што і гаварыць няма пра што, а з другога боку надтаж ужо расхвалівае бальшавіцкую колектывізацыю і наогул усё, што толькі комуністы могуць прыдумаць.

„Зрыў" агульнага сходу беларускага навуковага та-ва. У № 10 „Напераду" Луцкевіч скаржыцца, што група пасла Дварчаніна сарвала вызначаны на 2 сакавіка агульны сход Беларускага Навуковага Т-ва. Вось-жа мусімо выясьніць, што праўду кажучы, няма чаго там і зрываць. Справа ў тым, што гэнае Т-ва, праўда існуе ўжо даўно, але так-жа даўно яно існуе бадай толькі на паперы і ёсьць сяньня Луцкевічаўска-санацыйнай крамкай. Вялізарная большасьць беларускай інтэлігенцыі да гэнага Т-ва не належа.

З Літоўскага жыцьця.

З НЕЗАЛЕЖНАЙ ЛІТВЫ

Згода на транзытную комунікацыю з Польшчай. Газэты падалі да публічнага ведама зьмест мэмор'ялу, які літоўскі ўрад падаў Лізе Народаў у справе беспасрэднай комунікацыі між Польшчай і Літвой. У гэным мэмор'яле, літоўскі ўрад, бяручы пад увагу патрэбы трэціх старон, асабліва Латвіі, згаджаецца на рух транзытны між Польшчай і Літвой, з тэй аднак засьцярогай, што грамадзяне Літвы ня будуць мець права карыстацца транзытнымі цягнікамі для падарожы ў Вільню, а грамадзяне польскія ня будуць мець права высядаць на тэрыторыі літоўскай. Чыгунка лібава-роменская будзе адкрыта, але на тэрыторыі літоўскай цягнікі будуць мець характар толькі транзытны, гэта знача — будуць мець права толькі праезду.

На поўную комунікацыю мяйсцовую між Польшчай і Літвой Літва згадзіцца ня можа да тэй пары, покуль ня будзе ўладжаны спор за Вільню. Ня можа быць так-жа мовы аб комунікацыі між гэтымі дзяржавамі тэлеграфічнай і тэлефонічнай.

З ЛІТВЫ ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Зьезд вучыцялёў Т-ва „Рытас". На літоўскіх землях пад Польшчай школьную і агулам прасьветную працу сярод шырокіх літоўскіх масаў вядзе Т-ва „Рытас", якое працуе ўжо аддаўна дужа вытрывала і карысна. На чале гэтага Т-ва стаіць шырока ведамы літоўскі выдатны дзеяч кс. праф. П. Краўяліс.

9 г. м. у Вільні адбыўся гэтага Т-ва агульны гадавы зьезд. На зьездзе, між многімі іншымі справамі, зьвязанымі з літоўскай народнай асьветай, усімі ўчасьнікамі зьезду падчоркнута нястача літоўскай вучыцельскай сэмінарыі, ня маючы якоў, літоўскія вучыцялі, каб здабыць вымаганыя ўрадам кваліфікацыі, патрабуюць здаваць экзамены пры школьнай куратарыі, дзе часта спатыкаюць непрадбачаныя труднасьці. Т-ва „Рытас" мела сваю сэмінарыю, але польскія ўлады ў 1927 г. закрылі яе і дагэтуль адкрыць не дазваляюць.

З Украінскага жыцьця.

Суд над Украінскай Незалежнасьцяй. Бальшавікі распачалі ў Харкаве суд над Украінскімі вызваленцамі Украіны. Судзяць 45 чалавек. Галоўны абвінавачаны праф. Ефрэмаў заявіў **„мы дамагаемся незалежнай Украіны".**

Гэны суд над украінскімі вызваленцамі ёсьць судом над ідэяй **Украінскай незалежнасьці.**

З Польшчы.

Урад Бартля падаўся ў адстаўку. Сойм на сваім паседжаньні ў мінулым тыдні выразіў недавер аднаму з міністраў ураду п. Прыстару. З гэтай прычыны падаўся у адстаўку ўвесь урад. Прэзыдэнт адстаўку прыняў і даручыў тварыць новы урад марш. Сэнату Шыманскаму.

З заграніцы.

Англія аб прасьледаваньні рэлігіі ў С. С. Р. Р. і аб праваслаўнай царкве ў Польшчы. Як мы ўжо падавалі, што паводле разуменьня эўрапэйскіх дзяржаваў справа рэлігійная ня ёсьць унутранай справай кожнай дзяржавы, а справай міжнароднай, паводле якога разуменьня галава каталіцкага касьцёла папа Пій XI адзін з першых выступіў проціў прасьледаваньня рэлігіі ў С.С.Р.Р., а за ім іншыя прадстаўнікі рожных веравызнаньняў і дзяржаўныя мужы некаторых дзяржаваў.

Ангельскі міністр заграні́чных спраў Гэндэрсон загадаў свайму паслу ў С.С.Р.Р. даць падробна ўсе факты аб прасьледаваньні бальшавікамі рэлігіі ў С.С.Р.Р. Ангельскі пасол у С.С.Р.Р гэныя факты прасьледу даў, але міністр Гэндэрсон пакульшто іх да публічнага ведама не падаў. Ня выявіў іх нават і на дамаганьне паслоў парляманту, матывуючы сваю адмову тым, што мусіць ён яшчэ азнаёміцца з дакладам пасла ў С.С.Р.Р.

Пры гэтай нагодзе, адзін пасол ангельскага парляманту на паседжаньні 6 г. м. запытаў у міністра Гэндэрсона — ці атрымаў ён весткі ад ангельскага прадстаўніка ў Варшаве аб прасьледаваньні праваслаўнай царквы ў Польшчы. Мін. Гэндэрсон заявіў, што ён зьвярнуў увагу ангельскага пасла ў Варшаве на гэную справу і спадзяецца, што весткі атрымае, пасьля чаго зробіць адпаведны даклад у парляманце.

Як бачым Англія зацікавілася ня толькі прасьледяваньнем рэлігіі ў С.С.Р.Р., але і палажэньнем праваслаўнай царквы ў Польшчы.

Камуністы ў С.С.Р.Р. усёж такі збаяліся адпору вёскі. Бальшавікі, як мы ня раз пісалі, сілком заганялі сялян у камуну і зьдзекуючыся над рэлігіяй масава закрывалі сьвятыні. Рэч зразумелая, што такія дзікія паступкі камуністычных уладаў вельмі абурылі народ, асабліва сялян, якія ўжо ўзяліся за аружжа ў барацьбе з комуністамі. Бальшавікі спужаліся і выдалі закон сілком не заганяць у камуну і насільна не закрываць сьвятыняў. Гэта яны маюцца праводзіць дабравольна са згодай народу. А калі ня будзе прымусу, дык і камуны напэўна ня будзе і ў сьвятынях ня будуць камсамольскія клюбы, лазьні, склады і інш.

Словам, камуністы пад сільным адпорам вёскі пачалі ўжо адступаць. Няма ведама, ці яны і далей будуць адступаць ці зрабіўшы „перадышку" будуць яшчэ прабаваць з вольных людзей зрабіць камуністычных рабоў. Пажывём — пабачым.

Нямеччына ўжо таксама з камуністамі не цацкаецца. Нямецкі мін. загр. спраў Куртіус заявіў прадстаўніку С.С.Р.Р., што нямецкі ўрад будзе лічыць адказным урад С.С.С.Р. за камуністычныя выступленьні ў Нямеччыне, падгатаўляныя камінтэрнам.

Аб гаспадарцы.

Веснавое гнаеньне.

Першае, што трэба пільнаваць пры польнай гаспадарцы, каб мець добрыя ўраджаі, гэта належнае ўрабляньне грунту. За гэтым толькі ідзе гнаеньне. Аб гнаеньні, асабліва-ж аб гнаеньні гнаямі штучнымі ў нашыя часы гаворыцца і пішацца шмат. Але таму якраз і паўстаў такі „балаган", што селяніну разабрацца ў гэтым сапраўды больш як трудна. Як-жа справа з гэтым сапраўды прадстаўляецца ў зьвязку з гнаеньнем веснавым?

Акаповыя расьціны (бульба, буракі) найлепш аплачываюць кошты і труды гнаеньня. Гноіцца перадусім гноем хляўным (на га 20-30 вазоў), апрача таго акаповыя вельмі любуюцца ў штучным гнаеньні азоцістым і потасовым (калійным). З азоцістых даецца сягоньня найчасьцей азотняк (2-3 q на га), найлепш-жа, пару дзён перад садзьбой, прыбаранаваць у прыгатаваную глебу. З потасовых — даецца вясной на га 2-3 q 20 проц. патасовая соль. Замест потасовай солі даецца каініт, 5-6q на га. Трэба аднак яго даваць самай раньняй вясной. Да гэтага на га 2-q супэрфосфату.

Авёс вельмі добра выкарыстоўвае азоцістыя ўгнаеньні. На грунтах гноеных хлеўным гноем год таму назад (у другой гнойнай сіле) даецца пад авёс паўтара азотняку, 2-q 20 проц. потасовай солі і 2-q супэрфосфату на га.

Ячмень патрабуе многа ўгнаеньня, але ён вельмі „перэборлівы". Пасьля акаповых на хлеўным гнаі даецца пад ячмень насамперш 2-3-q 20 проц. потасовай солі, 2-q супэрфосфату ды 1-2$^{1}/_{2}$ q азотняку.

Азімыя хлебавіны, перадусім жыта, узмацняецца на вясну г. званым гнаеньнем на ліст. Азотняку даецца 1-1$^{1}/_{2}$ q на га, як

лепкам, як чорны трубачыст ня чорным радзіўся, а чорны таму, што працуе каля сажы. І пры нармальных абставінах далейшага жыцьця старавэры, пэўна-ж, хутка пазбыліся-б тых брыдкіх прыкметаў.

Ня можна прамаўчаць і аб некаторых дадатніх рысах характару старавераў. У першую можа чараду кідаецца іхная рэлігійнасьць. Усе правілы сваей рэлігіі старавэры выконваюць як найакуратней. Ды й ня дзіва. Будучы мучанікамі за веру, з пакаленьня ў пакаленьне перадавалі яны любоў да сваей рэлігіі і гэтую любоў яны трывала данясьлі аж да апошніх дзён. Спаміж рэлігійных правілаў старавераў, некаторыя могуць паказацца каталіку ці праваслаўнаму сьмешнымі. Напрыклад, няможна галіць барады, курыць табакі, піць і есьці з аднэй міскі з іноверцам; іншыя лічаць нават за грэх піць гарбату і водку. Аднак здаровы розум тутака нічога ня можа ўбачыць сьмешнага. Наадварот, шмат можна ўцяміць саўсім разумнага. Курэньне табакі, піцьцё водкі, а хаця-ж-бы й гарбаты, як даводзе гігіена, шкодзяць здароўю, а праз гэта, пэўна-ж, спажыцьцё гэтых прадуктаў ёсьць большым грахом, як, напрыклад, есьці каніну, якую ані каталікі, ані праваслаўныя не ядуць, лічучы гэта такжа бадай грэхам. Я ведаў старавера, жыўшага сто пятнаццаць гадоў. Ён ані разу ў жыцьці ня піў водкі, гарбаты, ня курыў табакі, пасьціў усе пасты, як трэба. А трэба ведаць, што пастоў у старавераў сто дзевяцьдзесят тры дні ў годзе.

Таксама, ці грэх ці ня грэх з каталіцкага ці праваслаўнага пункту гледжаньня есьці з іноверцамі з аднэй міскі, аднак-жа гігіена й тутака вучыць нас, што трэба кожнаму есьці з асобнай пасудзіны.

Вытрымаласьць старавера ў працы ведама кожнаму, хто хоць крыху чуў пра іх. Старавер бярэцца за самую цяжкую працу, якая беларусу здаецца не па сіле. Усім ведама „цёска" лесу, праца вязвычайна цяжкая, пры якой дзень-у-дзень трэба ад сонца да сонца махаць 12—13 хунтовай сякерай ці г. зв. „шклютам". Вось-жа кадры „цёшчыкаў" ці часакоў набіраюцца выключна са старавераў.

Старавер ахвотна працуе на зямлі, аднак ня гэтак крэпка прывязываецца да яе, як беларус. Ён ня з меншай ахвотай кідаецца на лясную працу, рыбалоўства, гандаль і г. д. Старавер шмат рухлівейшы за беларуса.

Як бачым, і ў старавераў ёсьць чаго падвучыцца беларусу.

Хроміч.

Да нас пішуць.

АСАДНІЦКАЯ КУЛЬТУРА.

Чаронка, Дзісненскага пав. Цяжка жывецца сялянам у нашых ваколіцах, адны толькі польскія асаднікі пагуліваюць. Атрымліваючы асаднікі пазычку за пазычкай, толькі пасьмейваюцца з сялян беларусаў, што „не ўмеён рацыянальне господажыць". Але-ж і яны ня лепш жывуць хоць і атрымліваюць пазычкі, бо атрымаўшы грошы надта часта забягаюць у растаран. Нашы вяскоўцы гэтай іхняй „культуры" вучыцца ня хочуць, а толькі прыглядаючыся як асаднікі—разумнікі „рацыянальне господажон" дзівяцца—чым гэтая „рацыянальнасьць" кончыцца.

Н.

толькі сойдзе сьнег, або як руль ужо добра „рушыць". За два-тры дні па такім гнаеньні жыта пажаўцее, „спаліцца", але потым узноў зазелянее. Нельга толькі азотняку разсеіваць на расьціны мокрыя ад дождажу, альбо ад расы.

(З працаў інж. Ад. Клімовіча).

АБ НАШАЙ ДВУМОЎНАЙ ШКОЛЕ.

Маркава, Маладэчанскага пав. У нас ёсьць двумоўная — польска-беларуская ўрадавая школа. У гэтай школе 3-х вучыцялёў, Кіраўнік школы паляк з пад Варшавы, другі вучыцель так-жа паляк адтуль-жа, а трэці свой тутэйшы беларус. Дзеці ўсе беларусы. Беларуская мова выкладаецца 2 гадзіны ў тыдзень. Выкладаюць беларускую мову палякі спосабам „pogadanek". Дык няведама, хто каго вучыць беларускай мовы ці вучыцялі вучняў, ці вучні вучыцялёў. Дык вось як выглядае польска-беларуская школа. Пара ператварыць нашу школу на чыста беларускую, бо такая, якая ёсьць, таксама, як і чыста польсакя нічога, добрага для нашых дзяцей ня дасьць.

П. Але.

СУМНА І СТЫДНА.

м. Дзятлава, Наваградзкага пав. Наша мястэчка за выняткам некалькіх урадоўцаў, прыехаўшых сюды з Польшчы і некалькіх сем'яў жыдоўскіх — чыста беларускае. Але пра працу нашых беларусаў сказаць няма чаго.

Да 1926 г. тут ішла барацьба полёнофільскай „Прасьветы" з „Грамадой". Разграмілі „Грамаду", прапала і „Прасьвета". Як адна арганізацыя, так і другая па сабе нацыянальную сьведамасьць пакінулі вельмі слабую. Ёсьць некалька асоб узгадаваных у чыста народніцкім беларускім нацыянальным духу, але мала. Карыстаючыся гэтай атсутнасьцяў сьведамых нацыянальна дзейных працаўнікоў на ніве беларускага адраджэньня, польскія арганізацыі пашыраюць сваю дзейнасьць сярод нашай моладзі з мэтай яе апалячаньня. У гэтых польскіх арганізацыях заўзята працуюць пераважна польскія вучыцялі. Арганізацыі гэтыя маюць назоў „Коло Млодзежы Польскай".

Дарагая Моладзь беларуская! З сумам глядзяць на вашу дзейнасьць і бяздзейнасьць старэйшыя. Крыўдна і сэрца баліць, што Вы беларускія дзеці і робіце для беларускага народу шкоду. Вы за часовае самазадаваленьне выракаецеся свайго роднага — звычаяў і традыцыяў сваіх дзядоў, бацькоў і прадзедаў, выракаецеся свайго народу і самых сябе. Сумна і стыдна.

Дарагая моладзь! апамятайся і зарганізуйся ў сваю беларускую арганізацыю, прыкладам Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры, ладзь свае беларускія прадстаўленьні, чытай беларускія кніжкі і газэты, выпішы часопісь для беларускай моладзі „Шлях Моладзі" і працуй на пацеху сваіх бацькоў і карысьць бацькаўшчыны.

Сьлёзнавокі.

ЗЕМЛЯРОБСКІ КРЫЗІС І СПОСАБ ЯГО ЛЯЧЭНЬНЯ.

Бурачкі, Нясьвіскага пав. Сучасны землязробскі крызіс у Польшчы моцна адбіваецца на сялянскіх гаспадарках і нашага краю. Цэны на прадукцыю земляробскай вытворчасьці з кожным днём падаюць. Так напр. у Клецку за пуд жыта больш не плацяць як 2,30, аўса 2, ячменю 2,30 і г. д.

У сувязі з гэтым эканамічнае палажэньне сялян вельмі пагоршала. Тыя сялянскія гаспадаркі, якія пры нармальнай цане на збожа маглі сяк-так стачыць канцы з канцамі, сяньня выраўняць сваіх даходаў з неабходнымі расходамі ніяк ня могуць.

З прычыны гэтай сяляне адмаўляюць сабе ў самых нават неабходных рэчах як: газа, мыла, цукар, абутак, адзежа і інш. Селянін наш вяртаецца ўжо ўзноў да прадзедаўскай лучыны. Усё менш і менш купляе фабрычныя вырабы, мануфактуру, абутак і інш., замяняючы гэтую „роскаш" вырабамі ўласнымі.

Я знаю такіх сялян, якія ўважаюць за неабходнасьць у сваіх гаспадарках земляробскія машыны, але з прычыны гэтага гаспадарчага крызысу купіць іх ніяк ня могуць і адкладаюць куплю гэтай „раскошы" на далей.

Бяручы пад увагу, што земляробскі крызіс перажывае ня толькі наш край, але і ўся Польшча, з якой эканамічнае жыцьцё нашага краю ў цяперашнія часы зьвязана, а Польшча рынкаў для збыту земляробскіх вырабаў пакульшто адпаведных ня мае і няма ведама ці будзе мець, прыходзіцца думаць, што крызіс гэты працягнецца і на далей.

Кожнаму ясна, што калі гэны земляробскі крызіс пры сучаснай структуры нашых гаспадарак патрывае некалькі гадоў, дык для нашых гаспадарак можа наступіць поўнае банкруцтва.

Каб не дапусьціцца да поўнага банкруцтва, трэба зьмяніць спосаб гаспадараваньня. Трэба больш зьвярнуць увагі на гадоўлю жывёлы, не прадаваць збожа, а карміць сьвіней і іншую жывёлу на мяса. Трэба арганізавацца ў земляробскія гурткі, каапэратывы для збыту, праз якія маглі б збываць па больш прызваітай цане свае земляробскія прадукты без пасрэднікаў гандляроў ды розных спэкулянтаў. Земляробская арганізацыя, але свая беларуская, зможа рэгуляваць цэны на прадукты і палепшыць быт сялянскіх гаспадарак. Пара аб гэтым думаць і арганізавацца ўсім беларускім земляробам у сваю беларускую земляробскую арганізацыю.

Мужычок.

Redkaja akazija!

Biełaruskaja Kniharnia PAHONIA

(WILINIA, Ludwisarskaja Nr. 1)
nižejpadanych cikawych i važnych knih 20-cioch aŭtaraŭ pradaje pa niabywała tannaj canie:

№№	Aŭtar i nazoŭ knihi	stałaja cana	źnižk. cana
1	**Андэрсэн Г—Хр. — Казкі.** Кніжыца гэтых казак мае шырокую славу. Дужа важная асаблівa для нашай моладзі	1,20	0,60
2	**Bobič I. Ks. dr.—Niadzielešnija Ewanhielii i Nawuki (3 častki).** Knižka karysnaja dla našaha duchawienstwa, jak padručnik biełaruskich kazańniaŭ, a tak-ža i dla narodu, jak nabožnaje światočnaje čytańnie.	3,00	1,00
3	**Додэ Альфонс — Сэкрэт дзядзькі Карніля і іншыя французкія творы ў перакладах.** Прыгожыя і цікавыя апавяданьні.	0,30	0,15
4	**Дуж-Душэўскі К. і Ластоўскі В. — Слоўнік геомэтрычных і трыганамэтрычных тэрмінаў і сказаў. (Расейска-беларускі і беларуска-расейскі).** Дужа карысны для беларускіх вучняў і студэнтаў.	2,00	0,50
5	**Dwornik Fr. dr. — Žyćcio św. Wacława.** Knižyca napisana cikawa, pryhoža wydana i bahata ilustrawana. .	1,00	0,50
6	**Грышкевіч Фр. — Веснавыя мэлёды.** Зборнік вершаў.	1,00	0,50
7	**Колас Якуб—Сымон Музыка.** Нязвычайна прыгожая паэма, твор вялікага беларускага паэта, празначаная для беларускай моладзі. Кніжка гэта павінна знайсьціся ў кожнай беларускай сялянскай хаце.	2,80	1,25
8	**Ластоўскі В. — Расійска-Крыўскі (беларускі) слоўнік.** Хто хоча грунтоўна знаць беларускую мову — слоўнік гэты мусіць мець. Слоўнік гэты найлепшы і найпаўнейшы з усіх дагэтуль вышаўшых беларускіх слоўнікаў. Кніга мае 832 стр.	15,00	5,00
6	**Ластоўскі В. — Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі.** Вялізарная гэта кніга на 776 стр. дае нам апісаньне, прыклады і ілюстрацыі беларускіх кніг ад X-га да пачатку XIX ст. Кнігу гэту павінен мець кожны беларускі інтэлігент.	45,00	15,00
10	**Лункевіч В. Закон жыцьця сярод жывёл і расьцін.** Кніжыца зьмяшчае ў дастуннай форме навуковыя весткі з жыцьця жывёлы і расьціны.	0,90	0,45
11	**Малышэў Н. — Фізыолёгія і анатомія чалавека.** Кніга гэта аб жыцьці і будове арганізму чалавека можа служыць падручнікам школьным, а також кнігай для саманавучаньня. Кніга багата ілюстравана	2,75	1,25
12	**Rešeć I. ks. dr. — Z historyi apolohietyki chryścijanskaj.** Karysnaja dla ŭsich tych, chto choča bližej paznać relihiju ahułam, a pradusim chryścijanskuju. . .	0,80	0,40
13	**Stankiewič St. — Śmiech nia hrech.** Duža cikawyja wieršy — žarty. .	0,65	0,40
14	**Сцэнічныя творы:** a) Боты b) Мікітаў лапаць c) Пакой у наймы d) Чорт і баба.	1,20	0,60
15	**Віппэр Р. праф.— Новая Гісторыя.**	2,50	1,00
16	**Віппэр Р. праф. — Навейшая Гісторыя** . . . . Абедзьве гісторыі Віппэра годныя для школы і для саманавучаньня.	3,20	1,00
17	**Сьпявак Блёндэль, з ангельскай мовы перакл. В. Л.** Прыгожае апавяданьне.	0,20	0,20
18	**Зеленскі В. — Ботаніка.** Кніжку гэту павінен мець кожны, хто жадае пазнаць цікавае жыцьцё расьцін. Кніга шмат мае ілюстрацыяў	4,75	1,50
19	**З роднае нівы.** Зборнік прыгожага пісьменства, папулярнае веды, інфармацыяў аб грамадзкім жыцьці і ўстановах. Кніжка багата ілюстравана. . .	1,00	0,50
20	**Stankiewič Ad. Ks. — Rodnaja mowa ŭ światyniach.** Histaryčny narys ab užywańni ŭ kaściele biełaruskaj mowy. Knižyca padaje cikawyja fakty, napisana dastupna, bahata ilustrawana. . .	1,50	1,00

Hramadzianie! Wyšejaznačanych duža tannych, cikawych i karysnych biełaruskich knih kniharnia „Pahonia" maje lik ahraničany, dziela hetaha kožny pawinien paśpiešycca z kuplaj ich. Zakazy dla prawincyi wysyłajucca poštaj pa atrymańni ŭsiej wartaści zakazaŭ, abo nakladnoj płataj (za pabraniem) pa atrymańni treciaj častki wartaści zakazu.

Biełaruskaja Kniharnia „PAHONIA"
Wilno, Ludwisarska 1.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Дрк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Альбін Стэповіч